Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ
ТЭХНАЛАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Кафедра беларускай мовы
Кафедра лесааховы і садова-паркавага будаўніцтва

РУСКА-БЕЛАРУСКІ СЛОЎНІК ПА ФІЗІЯЛОГІІ І БІЯХІМІІ РАСЛІН

для студэнтаў спецыяльнасцей Т 16.01.00, Т 16.02.00

Мінск 2001

УДК 808.26(038)=002=82=826

Разгледжаны і рэкамендаваны да выдання рэдакцыйна-выдавецкай радай універсітэта

Складальнікі: ст. выкл. Н. Я. Савіцкая;
дац. М. І. Баранаў

Рэцэнзенты: загадчык кафедры беларускага мовазнаўства БДПУ імя М. Танка дац. П. А. Міхайлаў;
дацэнт кафедры арганічнай хіміі БДТУ Я. Г. Міляшкевіч

Па тэматычным плане выданняў вучэбна-метадычнай літаратуры універсітэта на 1997 г.

Для студэнтаў спецыяльнасцей Т 16.01.00 «Лясная гаспадарка» і Т 16.02.00 «Садова-паркавае будаўніцтва».

УВОДЗІНЫ

Дадзены руска-беларускі слоўнік уключае каля 4,3 тыс. тэрмінаў і тэрміналагічных словазлучэнняў, якія найбольш часта выкарыстоўваюцца ў вучэбнай і навуковай літаратуры па фізіялогіі і біяхіміі раслін.

Словы падаюцца ў алфавітным парадку. Тэрміны, утвораныя ад аднаго кораня рознымі часцінамі мовы, прадстаўлены ў найбольш ужывальнай форме, калі не ўяўляюць цяжкасці для перакладу. Назоўнікі прыведзены ў назоўным склоне, а для неадушаўлёных назоўнікаў мужчынскага роду ў родным склоне пазначаны канчатак -а(-я) або -у(-ю), які залежыць ад семантыкі слоў. Канкрэтныя расліны або іх часткі, якія паддаюцца лічэнню, маюць канчатак -а(-я): храстка, прарoстка, грыба, жолуда. Калі ж назоўнікі абазначаюць працэсы, з'явы, дзеянні, стан, якасці расліны, рэчывы або маюць элемент некаторай умоўнасці, неканкрэтнасці, зборнасці, надзвычайнай дробнасці, невыдзеленасці з цэлага, то яны маюць канчаткі -у(-ю): мезафілу, артэфакту, апаферменту, сапрафіту, аэратаксісу, веламену, банігэту, біятэсту, біясінтэзу, біяпатэнцыялу, віду, налёту, плазмолізу, аднаўніку, матрыксу, мікракомплексу, дэрматагену, глабуліну, рэпрэсару і г. д. Варта адзначыць, што ў шматлікіх слоўніках, з якімі азнаёміліся аўтары, не заўсёды сістэматызавана падаюцца канчаткі пэўных лексіка-семантычных груп слоў або яны зусім не прыводзяцца, і аўтарамі зроблена спроба стварыць такую сістэматызацыю.

Акрамя вышэйадзначанай складанасці, цяжкасці выклікае правапіс д, т у запазычаных словах, які таксама перадаецца непаслядоўна, і аўтары прымаюць канцэпцыю многіх стваральнікаў хімічнай тэрміналогіі — выкарыстоўваць напісанне -тын- у тэрмінах, якія абазначаюць рэчывы, напр.: калхіцын, зеатын, каратын, фітын, тымідын, цытыдын і інш.

Варта спыніцца і на перакладзе дзеепрыметнікаў, большасць формаў якіх неўжывальныя ў беларускай мове, таму аўтары імкнуліся перакладаць іх прыметнікамі з суфіксамі -альн-, -оўн-, -н-: восходящий — узыходны, зимующий — зімавальны, выстилающий — высцілальны.

Абмежавана выкарыстоўваецца ў дзеясловах, аддзеяслоўных назоўніках, прыметніках і дзеепрыметніках не характэрны для беларускай мовы суфікс -ір-: диссоциированный — дысацыяваны, циркулировать — цыркуляваць, фосфорилирование — фасфарыляванне.

Калі рускае слова ў беларускай мове мае некалькі значэнняў, то ў перакладзе прыводзіцца толькі той тэрмін, які ўжываецца ў біялогіі.

У 90-я гады адбыўся актыўны працэс тэрмінатворчасці. У друку з'явілася шмат тэрміналагічных слоўнікаў, якія маюць рэкамендацыйны характар. Найбольш часта ўжывальныя тэрміны з гэтых слоўнікаў прыведзены ў рэестры побач з нарматыўнымі і падаюцца ў дужках.

А

АБАКСИАЛЬНЫЙ - абаксіёны
АБЕРРАЦИЯ - аберацыя, адхіленне
АБИОТИЧЕСКИЙ - абіятычны
АБСОРБИРОВАТЬ - абсарбаваць
АБСОРБЦИЯ - абсорбцыя
АБСЦИЗИНЫ - абсцызіны
АБСЦИЗОВАЯ КИСЛОТА - абсцызавая кіслата
АВИТАМИНОЗ - авітаміноз, -зу
АВТОГАМИЯ - аўтагамія
АВТОКАТАЛИЗ - аўтакаталіз, -зу
АВТОЛИЗ - аўтоліз, -зу
АВТОСТЕРИЛЬНОСТЬ - аўтастэрыльнасць
АВТОТРОФНЫЙ - аўтатрофны
АВТОФАГИЯ - аўтафагія
АГАР-АГАР - агар-агар, -ру
АГЛИКОН - аглікон, -ну
АГГЛЮТИНАЦИЯ - аглютынацыя, склейванне
АГРАНАЛЬНЫЙ - агранальны
АГРЕГАЦИЯ - агрэгацыя
АГРОБИОЛОГИЯ - аграбіялогія
АГРОНОМИЯ - аграномія
АГРОТЕХНИКА - агратэхніка
АГРОФИТОЦЕНОЗ - аграфітацэноз, -зу
АГРОХИМИЯ - аграхімія
АДАКСИАЛЬНЫЙ - адаксіёны
АДАПТАЦИЯ - адаптацыя
АДВЕНТИВНЫЙ - адвентыўны
АДГЕЗИОННЫЙ - адгезійны
АДДИТИВНОСТЬ - адытыўнасць
АДЕКВАТНЫЙ - адэкватны
АДЕНИЛАТЦИКЛАЗА - адэнілатцыклаза
АДЕНИН - адэнін, -ну
АДЕНОЗИНДИФОСФАТ - адэназіндыфасфат, -ту
АДЕНОЗИНМОНОФОСФАТ - адэназінмонафасфат, -ту
АДЕНОЗИНТРИФОСФАТ - адэназінтрыфасфат, -ту
АДКРУСТАЦИЯ - адкрустацыя
АДСОРБЕНТ - адсарбент, -ту
АДСОРБЦИЯ - адсорбцыя
АЗОТ - азот, -ту
АЗОТИСТЫЙ - азоцісты
АЗОТОБАКТЕР - азотабактэр, -ру
АЗОТОБАКТЕРИН - азотабактэрын, -ну
АЗОТСОДЕРЖАЩИЙ - азотазмяшчальны
АЗОТФИКСАЦИЯ - азотфіксацыя
АККЛИМАТИЗАЦИЯ - акліматызацыя
АККУМУЛЯЦИЯ - акумуляцыя
АКРОПЕТАЛЬНЫЙ - акрапетальны
АКТИВАЦИЯ - актывацыя
АКТИВНОСТЬ - актыўнасць
АКТИН - актын, -ну
АКТИНОМИЦЕТЫ - актынаміцэты
АКТИНОМОРФНЫЙ - актынаморфны
АКТОМИОЗИН - актаміязін, -ну
АКЦЕПТОР - акцэптар, -ра
АЛАНИН - аланін, -ну
АЛЕЙРОНОВЫЙ СЛОЙ - алейронавы слой
АЛИФАТИЧЕСКИЙ - аліфатычны
АЛИЦИКЛИЧЕСКИЙ - аліцыклічны
АЛКАЛОИД - алкалоід, -ду
АЛКОГОЛЬ - алкаголь, -лю
АЛКОГОЛЬДЕГИДРОГЕНАЗА - алкагольдэгідрагеназа
АЛЛЕЛОПАТИЯ - алелапатыя
АЛЛОМЕТРИЯ - аламетрыя
АЛЛОСТЕРИЧЕСКИЙ - аластэрычны

АЛЬБИНОС - альбінос, -са
АЛЬДЕГИД - альдэгід, -ду
АЛЬДОЗА - альдоза
АЛЬДОЛАЗА - альдалаза
АЛЬФА-ЛУЧИ - альфа-прамяні
АЛЬФА-ЧАСТИЦА - альфа-часціца
АМИДИРОВАНИЕ - амідаванне
АМИЛАЗА - амілаза
АМИЛОЗА - амілоза
АМИЛОПЕКТИН - амілапектын, -ну
АМИЛОПЛАСТ - амілапласт, -та
АМИН - амін, -ну
АМИНИРОВАНИЕ - амінаванне
АМИНОКИСЛОТА - амінакіслата
АМИНОПЕПТИДАЗА - амінапептыдаза
АМИНОТРАНСФЕРАЗА - амінатрансфераза
АМИНОУКСУСНАЯ КИСЛОТА - амінавоцатная кіслата
АМИТОЗ - амітоз, -зу
АММИАК - аміяк, -ку
АММИАЧНАЯ СЕЛИТРА - аміячная салетра
АММОНИЙ - амоній, -ію; амонь, -ню
АММОНИЙНЫЙ - аманійны, амоневы
АМФОТЕРНОСТЬ - амфатэрнасць
АНАБИОЗ - анабіёз, -зу
АНАБОЛИЗМ - анабалізм, -му
АНАЛИЗ - аналіз, -зу
АНАЛИЗАТОР - аналізатар, -ра
АНАЛИТИЧЕСКИЙ - аналітычны
АНАТОМИЧЕСКИЙ - анатамічны
АНАТОМИЯ - анатомія
АНАФАЗА - анафаза
АНАЭРОБ - анаэроб, -ба
АНАЭРОБИОЗ - анаэрабіёз, -зу
АНАЭРОБНЫЙ - анаэробны
АНЕМОФИЛИЯ - анемафілія
АНИОН - аніён, -на
АНОМАЛИЯ - анамалія
АНТАГОНИЗМ - антаганізм, -му
АНТЕЗИН - антэзін, -ну
АНТЕННА - антэна
АНТЕРИДИЙ - антэрыдый, -ыя
АНТИБИОТИК - антыбіётык, -ку
АНТИГЕН - антыген, -ну
АНТИКЛИНАЛЬНЫЙ - антыклінальны
АНТИКОДОН - антыкадон, -ну
АНТИМУТАГЕН - антымутаген, -ну
АНТИОКСИДАНТ – антыаксідант, -ту, антыакісляльнік, -ку
АНТИПОДЫ - антыподы
АНТИСЕПТИК - антысептык, -ку
АНТИТЕЛО - антыцела
АНТОЦИАН - антацыян, -ну
АПЕКС - апекс, -са
АПЕРТУРА - апертура
АПИКАЛЬНОЕ ДОМИНИРОВАНИЕ - апікальнае дамінаванне
АПОПЛАСТ - апапласт, -та
АПОФЕРМЕНТ - апафермент, -ту
АППАРАТ - апарат, -ту
А. ГОЛЬДЖИ - а. Гольджы
АППОЗИЦИОННЫЙ РОСТ - апазіцыйны рост, -ту
АППОЗИЦИЯ - апазіцыя
АРАБИНОГАЛАКТАН - арабінагалактан, -ну
АРАБИНОЗА - арабіноза
АРБОРИЦИД - арбарыцыд, -ду
АРГИНИН - аргінін, -ну
АРОМАТИЧЕСКИЙ - араматычны
АРОМАТИЧЕСКОЕ СОЕДИНЕНИЕ - араматычнае злучэнне
АРТЕФАКТ - артэфакт, -ту
АРХЕГОНИЙ - архегоній, -і
АРХИТЕКТОНИКА - архітэктоніка
АСИММЕТРИЯ - асіметрыя
АСИНХРОННЫЙ - асінхронны

АСКОРБАТОКСИДАЗА - аскарбатаксідаза
АСКОРБИНОВАЯ КИСЛОТА - аскарбінавая кіслата
АСПАРАГИН - аспарагін, -ну
АСПАРАГИНОВАЯ КИСЛОТА - аспарагінавая кіслата
АССИМИЛИРОВАТЬ - асіміляваць
АССИМИЛЯТЫ- асіміляты
АССОЦИАЦИЯ - асацыяцыя
АТАВИЗМ - атавізм, -му
АТРОПИН - атрапін, -ну
АТТРАГИРОВАНИЕ - атрагаванне
АТТРАГИРОВАТЬ - атрагаваць
АТТРАГИРУЮЩИЙ ЦЕНТР - атрагавальны цэнтр
АТТРАКТАНТ - атрактант, -ту
АУКСАНОМЕТР - аўксанометр, -ра
АУКСИН - аўксін, -ну
АУТЭКОЛОГИЯ - аўтэкалогія
АХРОМАТИН - ахраматын, -ну
АЦЕТАЛЬДЕГИД - ацэтальдэгід, -ду
АЦЕТАТ - ацэтат, -ту
АЦЕТАТКИНАЗА - ацэтаткіназа
АЦЕТИЛ - ацэтыл, -лу
АЦЕТИЛКОФЕРМЕНТ - ацэтылкафермент, -ту
АЦЕТИЛТРАНСФЕРАЗА - ацэтылтрансфераза
АЦЕТОН - ацэтон, -ну
АЭРАЦИЯ - аэрацыя
АЭРЕНХИМА - аэрэнхіма
АЭРОБ - аэроб, -ба
АЭРОБИОЗ - аэрабіёз, -зу
АЭРОБНЫЕ БАКТЕРИИ - аэробныя бактэрыі
АЭРОБНЫЙ - аэробны
АЭРОЗОЛЬ - аэразоль, -лі
АЭРОТАКСИС - аэратаксіс, -су
АЭРОТРОПИЗМ - аэратрапізм, -му

Б

БАЗАЛЬНЫЙ - базальны
БАКТЕРИАЛЬНЫЙ - бактэрыйны, бактэрыяльны
БАКТЕРИОФАГ - бактэрыяфаг, -га
БАКТЕРИОХЛОРОФИЛЛ - бактэрыяхларафіл, -лу
БАКТЕРИЦИДНОСТЬ - бактэрыцыднасць
БАКТЕРОИД - бактэроід, -да
БАНЯ (лабор.) - грэлка
Б. ВОДЯНАЯ - г. вадзяная
Б. ВОЗДУШНАЯ - г. паветраная
Б. ПЕСОЧНАЯ - г. пясочная, пясковая
БАРИЙ - барый, -ю: бар, -ру
БАРИТ - барыт, -ту
БЕЗВОДНЫЙ - бязводны
БЕЗВРЕДНЫЙ - нашкодны, бясшкодны
БЕЗЖИЗНЕННЫЙ - безжыццёвы, змярцвелы
БЕЗЗОЛЬНЫЙ - бяззольны, бяспопельны
БЕЗЛЕПЕСТНОЙ - беспялёсткавы
БЕЗЛИСТНЫЙ - бязлісты
БЕЗУСЛОВНЫЙ - безумоўны
БЕЗЪЯДРОВЫЙ - без'ядровы
БЕЛКОВЫЙ - бялковы
БЕЛОК - бялок, -лку
БЕНЗИДИН - бензідын, -ну
БЕНЗИЛАДЕНИН - бензіладэнін, -ну
БЕНЗОЙНАЯ КИСЛОТА - бензойная кіслата
БЕНЗОЛ - бензол, -лу
БЕСКИСЛОРОДНЫЙ - бескіслародны
БЕСПЛОДИЕ - бясплоднасць
БЕСПОЛЫЙ - бясполы

БЕСПУЧКОВЫЙ - беспучковы
БЕССЕМЯННЫЙ - безнасенны
БЕССТЕБЕЛЬНЫЙ - бессцябловы
БЕСХЛОРОФИЛЬНЫЙ - бесхларафільны
БИКОЛЛАТЕРАЛЬНЫЙ - бікалатэральны
БИЛАТЕРАЛЬНЫЙ - білатэральны
БИМОЛЕКУЛЯРНЫЙ - бімалекулярны, бімалекульны, двухмалекульны
БИНАРНАЯ НОМЕНКЛАТУРА - бінарная наменклатура
БИНАРНЫЙ - бінарны, двухскладны
БИОГЕНЕЗ - біягенез, -зу
БИОГЕННАЯ СРЕДА - біягеннае асяроддзе
БИОГЕННЫЙ ЭЛЕМЕНТ - біягенны элемент, -та
БИОГЕОЦЕНОЗ - біягеацэноз, -зу
БИОКАТАЛИЗАТОР - біякаталізатар, -ра
БИОЛОГИЧЕСКАЯ ПРОДУКТИВНОСТЬ - біялагічная прадукцыйнасць
БИОЛОГИЧЕСКИЙ - біялагічны
Б. РИТМ - б. рытм, -му
Б. ПОТЕНЦИАЛ - б. патэнцыял, -лу
БИОЛОГИЧЕСКИЕ ЧАСЫ - біялагічны гадзіннік, -ка
БИОЛЮМИНЕСЦЕНЦИЯ - біялюмінесцэнцыя
БИОМАССА - біямаса
БИОС - біёс, -су
БИОСИНТЕЗ - біясінтэз, -зу
БИОСФЕРА - біясфера
БИОТЕСТ - біятэст, -ту
БИОТЕХНОЛОГИЯ - біятэхналогія
БИОФИЗИКА - біяфізіка
БИОХИМИЯ - біяхімія
БИОЦЕНОЗ - біяцэноз, -зу
БИОЦЕНОТИЧЕСКИЙ - біяцэнатычны
БИОЭЛЕКТРИЧЕСКИЙ - біяэлектрычны
БИОЭНЕРГЕТИКА - біяэнергетыка
БЛИЖНИЙ - блізкі, бліжэйшы
Б. ТРАНСПОРТ - б. транспартаванне; б. перанос
БОКОВОЙ - бакавы
БОКОВЫЕ ПОЧКИ - бакавыя пупышкі
БОЛОТО - балота
БОЛЬШОЙ - вялікі
Б. ПЕРИОД РОСТА - в. перыяд росту
БОНИТЕТ - банітэт, -ту
БОР (сосновый) - бор, -ру
БОР (металл) - бор, -ру
БОРЬБА - барацьба
Б. ЗА СУЩЕСТВОВАНИЕ - б. за існаванне
БРАХИБЛАСТ - брахібласт, -та
БРОЖЕНИЕ - браджэнне, бруzаванне
Б. МАСЛЯНОКИСЛОЕ - б. маслянакіслае
Б. СПИРТОВОЕ - б. спіртавое
Б. УКСУСНОКИСЛОЕ - б. воцатнакіслае
БРОУНОВСКОЕ ДВИЖЕНИЕ - броўнаўскі рух, -ху
БРУТТО-АССИМИЛЯЦИЯ - брута-асіміляцыя
БРУТТО-МАССА – брута-маса
БУМАГА - папера
Б. ИНДИКАТОРНАЯ - п. індыкатарная
БУМАГА ЛАКМУСОВАЯ - папера лакмусавая
Б. ХРОМАТОГРАФИЧЕСКАЯ - п. храматаграфічная

Б. ФИЛЬТРОВАЛЬНАЯ - п. фільтравальная, цадзільная
БУФЕРНОСТЬ - буфернасць
БУФЕРНЫЙ РАСТВОР - буферны раствор
БЫСТРОРАСТВОРИМЫЙ - хуткараствaральны
БЫСТРОРАСТУЩИЙ - хуткарослы
БЮРЕТКА - бюрэтка

В

ВАКУОЛИЗАЦИЯ - вакуалізацыя
ВАКУОЛЬ - вакуоля
В. ВЫДЕЛИТЕЛЬНАЯ - в. выдзяляльная
В. СЕКРЕТОРНАЯ - в. сакраторная
В. СОКРАТИТЕЛЬНАЯ - в. скарачальная
В. ЦЕНТРАЛЬНАЯ - в. цэнтральная
ВАКУОЛЯРНЫЙ - вакуольны
ВАКУУМ - вакуум, -му
ВАЛЕНТНОСТЬ - валентнасць
ВАЛИН - валін, -ну
ВАРИАНТ - варыянт, -та
ВЕГЕТАТИВНЫЙ - вегетатыўны
ВЕГЕТАЦИОННЫЙ - вегетацыйны
ВЕГЕТАЦИЯ - вегетацыя
ВЕДЬМИНЫ МЕТЛЫ - ведзьміны мяцёлкі
ВЕЗИКУЛА - везікула
ВЕЗИКУЛЯРНОЕ ТЕЛО - везікулавае цела
ВЕЛАМЕН - веламен, -ну
ВЕЛИЧИНА - велічыня
В. ПРИРОСТА - в. прыросту
ВЕНТИЛЯЦИОННЫЙ - вентыляцыйны
ВЕНТРАЛЬНЫЙ - вентральны
ВЕНЧИК - венчык, -ка
ВЕРБАСКОЗА - вербаскоза
ВЕРЕТЕНО - верацяно
В. ДЕЛЕНИЯ - в. дзялення, падзелу
ВЕРЕТЕНОВИДНЫЙ - вераценападобны
ВЕРНАЛИН - вернaлін, -ну
ВЕРОЯТНОСТЬ - імавернасць
ВЕРХУШЕЧНЫЙ - верхавінкавы
ВЕРХУШКА - верхавіна
ВЕРШИНА - вяршыня
ВЕС - вага
ВЕСЫ - вагі, -гаў,
(с коромыслом) шалі, -ляў
В. ТОРЗИОННЫЕ - в. тарзійныя
ВЕТВИСТЫЙ - галінасты
ВЕТВИТЬСЯ - галінавацца, разгаліноўвацца
ВЕТВЛЕНИЕ - галінаванне
ВЕТВЬ - галіна
ВЕТЕР - вецер, ветру
ВЕТКА - галіна, галінка
ВЕТКОПАД - галінкапад, -ду
ВЕТОЧКА - галінка
ВЕТРООПЫЛЕНИЕ - ветраапыленне
ВЕТРООПЫЛЯЕМЫЙ - ветраапылкавальны
ВЕЧНОЗЕЛЕНЫЙ - вечназялёны
ВЕЩЕСТВО - рэчыва
ВЗАИМНОСТЬ - узаемнасць
ВЗАИМОВЛИЯНИЕ - узаемаўплыў, -ву
ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ - узаемадзеянне
ВЗАИМОЗАВИСИМОСТЬ - узаемазалежнасць
ВЗАИМОЗАМЕНЯЕМОСТЬ - узаемазаменнасць, узаемазамяняльнасць

ВЗАИМООТНОШЕНИЕ - узаемаадносіны
ВЗАИМОПОМОЩЬ - узаемадапамога
ВЗАИМОСВЯЗЬ - узаемасувязь
ВЗБАЛТЫВАТЬ - узбоўтваць
ВЗВЕСЬ - завісь
ВЗВЕШЕННОЕ СРЕДНЕЕ - узважанае сярэдняе
ВЗВЕШЕННЫЕ ВЕЩЕСТВА - завіслыя рэчывы
ВЗВЕШИВАНИЕ - узважванне
ВЗДУТИЕ - уздуцце, успучанасць
ВЗДУТЫЙ - уздуты, успучаны
ВЗМУТИТЬ - змуціць, скаламуціць
ВЗРОСЛЫЙ - дарослы
ВИД - від, -ду
ВИДИМЫЙ ФОТОСИНТЕЗ - бачны фотасінтэз, -зу
ВИДОВОЙ - відавы
ВИДООБРАЗОВАНИЕ - відаўтварэнне
ВИОЛАКСАНТИН - віёлаксантын, -ну
ВИРУЛЕНТНОСТЬ - вірулентнасць
ВИРУС - вірус, -са
ВИТАЛИЗМ - віталізм, -му
ВИТАЛЬНОЕ ОКРАШИВАНИЕ - вітальнае афарбоўванне
ВИТАМИН - вітамін, -ну
ВИТАМИНОНОСНЫЙ - вітамінаносны
ВИТРИФИКАЦИЯ - вітрыфікацыя
ВЛАГА - вільгаць
ВЛАГАЛИЩЕ - похва
В. КОРНЕВОЕ - п. каранёвая
В. ЛИСТОВОЕ - п. ліставая
В. СТЕБЛЕВОЕ - п. сцябла; сцябловая п.
ВЛАГОЕМКОСТЬ - вільгацяёмістасць
ВЛАГОСОДЕРЖАНИЕ - вільгацеўтрыманне, вільгацезмяшчэнне
ВЛАГОЛЮБИВЫЙ - вільгацелюбівы
ВЛАГООБЕСПЕЧЕННОСТЬ - вільгацезабяспечанасць
ВЛАЖНОСТЬ - вільготнасць
В. АБСОЛЮТНАЯ - в. абсалютная
В. ОТНОСИТЕЛЬНАЯ - в. адносная
ВЛИЯНИЕ - уплыў, -ву
ВЛИЯТЬ - уплываць
ВМЕСТИЛИЩЕ - ёмішча, умяшчальня, -ні
В. ВЫДЕЛЕНИЙ - ё. выдзяленняў
ВМЕСТИМОСТЬ - ёмістасць, умяшчальнасць
ВНЕДРЕНИЕ - укараненне
ВНЕКЛЕТОЧНЫЙ - пазаклеткавы
ВНЕКОРНЕВАЯ ПОДКОРМКА - пазакаранёвая падкормка
ВНЕКОРНЕВОЕ ПИТАНИЕ - пазакаранёвае жыўленне
ВНЕУСТЬИЧНАЯ ТРАНСПИРАЦИЯ - пазавусцейкавая транспірацыя
ВНЕШНЕЕ ДАВЛЕНИЕ - вонкавы (знешні) ціск, -ку
ВНЕШНИЙ - вонкавы, знешні
ВНЕШНИЙ ВИД - знешні выгляд, -ду
ВНЕШНЯЯ СРЕДА - вонкавае асяроддзе
ВНУТРЕННИЙ - унутраны, нутраны
ВНУТРИВИДОВОЙ - унутрывідавы
ВНУТРИКЛЕТОЧНЫЙ - унутрыклеткавы
ВНУТРИМОЛЕКУЛЯРНЫЙ - унутрымалекулярны, унутрымалекульны
ВОГНУТЫЙ ПЛАЗМОЛИЗ - вагнуты плазмоліз, -зу
ВОДНЫЙ РЕЖИМ - водны рэжым, -му
В. ОБМЕН - в. абмен, -ну

ВОДОНЕПРОНИЦАЕМОСТЬ - воданепранікальнасць
ВОДОНОСНЫЙ - ваданосны
ВОДООБЕСПЕЧЕННОСТЬ - водазабяспечанасць
ВОДООТНИМАЮЩИЙ - водаадымальны
ВОДООТТАЛКИВАЮЩИЙ - воданепрымальны
ВОДОПОГЛОЩЕНИЕ - водапаглынанне
ВОДОПРОВОДЯЩИЙ - водаправодзячы
ВОДОПРОНИЦАЕМОСТЬ - водапранікальнасць
ВОДОРАСТВОРИМОСТЬ - водараствaральнасць
ВОДОРОДНЫЙ - вадародны
В. ПОКАЗАТЕЛЬ - в. паказчык, -ка
ВОДОРОСЛЬ - водарасць
ВОДОСНАБЖЕНИЕ - водазабеспячэнне
ВОДОСОДЕРЖАНИЕ - водазмяшчэнне, водаўтрыманне
ВОДЯНОЙ ПОБЕГ - вадзяны парастак, -тка
ВОЗБУДИМОСТЬ - узбуджальнасць
ВОЗБУДИТЕЛЬ БОЛЕЗНИ - узбуджальнік хваробы
ВОЗБУЖДЕНИЕ - узбуджэнне, узбуджанасць, узрушанасць
ВОЗБУЖДЕННОЕ СОСТОЯНИЕ - узбуджаны стан, -ну
ВОЗВРАТ - вяртанне
ВОЗДЕЙСТВИЕ - уздзеянне
ВОЗДЕЛЫВАНИЕ - вырошчванне
ВОЗДУХОЕМКОСТЬ - паветраёмістасць
ВОЗДУХОНОСНЫЙ - паветраносны
ВОЗДУШНЫЙ - паветраны
ВОЗНИКНОВЕНИЕ - узнікненне
ВОЗОБНОВЛЕНИЕ - аднаўленне
ВОЗОБНОВЛЯТЬ - аднаўляць
ВОЗРАСТ - узрост, -ту
ВОЗРАСТАНИЕ - узрастанне
ВОЗРАСТНОЙ - узроставы
ВОЙЛОЧНЫЙ - лямцавы
ВОЛОКНА - валокны
ВОЛОКНИСТЫЙ - валакністы
ВОЛОСКИ - валаскі
ВОЛЧОК - ваўчок, -чка; ятожылак, -лка, парастак, -тка
ВОСК - воск, -у
ВОСКОВОЙ НАЛЕТ - васковы налёт, -ту
ВОСПЛАМЕНЕНИЕ - узгаранне, загаранне
ВОСПРИИМЧИВОСТЬ - успрымальнасць
ВОСПРИИМЧИВЫЙ - успрымальны
ВОСПРИЯТИЕ - успрыманне
ВОСПРОИЗВЕДЕНИЕ - узнаўленне
ВОСПРОИЗВОДСТВО - узнаўленне
ВОССТАНОВИТЕЛЬ - аднаўнік, -ка; аднаўляльнік, -ка
ВОССТАНОВИТЕЛЬНАЯ СПОСОБНОСТЬ - аднаўляльная здольнасць
ВОССТАНОВЛЕНИЕ - аднаўленне
ВОСХОДЯЩИЙ ПОТОК - узыходная плынь
ВПИТЫВАТЬ - убіраць, уліваць
ВПЯЧИВАНИЕ - упячванне
ВРАСТАНИЕ - урастанне
ВРАЩЕНИЕ - вярчэнне
ВРЕД - шкода
ВРЕДИТЕЛЬ - шкоднік, -ка
ВРЕДИТЬ - шкодзіць
ВРЕДНОСТЬ - шкоднасць
ВРЕДОНОСНЫЙ - шкодны, шкадлівы
ВРЕМЕННЫЙ - часовы
ВРЕМЯ - час, пара

В. ГОДА - п. года
В. ПРЕЗЕНТАЦИИ - ч. прэзентацыі
ВРОЖДЕННЫЙ - прыроджаны
ВРОСШИЙ - урослы, які ўрос
ВСАСЫВАНИЕ - усмоктванне
ВСАСЫВАЮЩИЙ - усмоктвальны
ВСПОМОГАТЕЛЬНЫЙ - дапаможны
ВСТАВОЧНЫЙ - уставачны
ВСТРЕЧАЕМОСТЬ - сустракальнасць
ВСТРЯХИВАНИЕ - устрэсванне, узварушванне
ВСХОД (процесс) - усход, -ду
ВСХОЖЕСТЬ - усходжасць
ВТОРИЧНЫЙ - другасны
ВТОРОСТЕПЕННЫЙ - другарадны, пабочны
ВТЯГИВАЮЩИЙ - уцягвальны
ВЫВЕТРИВАНИЕ - выветрыванне
ВЫВОДНОЕ ОТВЕРСТИЕ - вывадная адтуліна
ВЫГОНКА РАСТЕНИЙ - выганка раслін
ВЫДЕЛЕНИЕ - выдзяленне
ВЫДЕЛИТЕЛЬНАЯ КЛЕТКА - выдзяляльная клетка
ВЫДЕРЖИВАНИЕ - вытрымліванне
ВЫЖИВАЕМОСТЬ - выжывальнасць
ВЫЖИМАНИЕ - выцісканне
ВЫЖИМАТЬ - выціскаць
ВЫЗРЕВАНИЕ - выспяванне
ВЫЗРЕВАТЬ - выспяваць
ВЫКЛЮЧЕНИЕ - выключэнне
ВЫКОЛАШИВАНИЕ - каласаванне
ВЫМЕРЗАНИЕ - вымярзанне
ВЫМИРАНИЕ - выміранне
ВЫМОКАНИЕ - вымаканне
ВЫМОРАЖИВАНИЕ - вымарожванне
ВЫМЫВАНИЕ - вымыванне
ВЫНОС - вынас, -су
ВЫНУЖДАТЬ - вымушаць, змушаць
ВЫНУЖДЕННЫЙ ПОКОЙ - вымушаны спакой
ВЫПАДАТЬ - выпадаць
ВЫПАДЕНИЕ - выпаданне
ВЫПИРАНИЕ - выціранне
ВЫПРЕВАНИЕ - выправанне
ВЫПУКЛЫЙ ПЛАЗМОЛИЗ - выпуклы, пукаты плазмоліз, -зу
ВЫРАЩИВАНИЕ - вырошчванне
ВЫРОЖДЕНИЕ - выраджэнне
ВЫСАЖИВАТЬ - высаджваць
ВЫСЕВАТЬ - высяваць
ВЫСОКОГОРНЫЙ - высакагорны
ВЫСОКООРГАНИЗОВАННЫЙ - высокаарганізаваны
ВЫСОКОЭНЕРГЕТИЧЕСКИЙ - высокаэнергетычны
ВЫСТИЛАТЬ - высцілаць
ВЫСТИЛАЮЩИЙ - высцілальны
ВЫСШИЕ РАСТЕНИЯ - найвышэйшыя расліны
ВЫСЫХАНИЕ - высыханне
ВЫТЕСНЕНИЕ - выцясненне, выцісканне
ВЫТЯЖКА - выцяжка, экстракт
ВЬЮЩИЙСЯ СТЕБЕЛЬ - павойнае сцябло; сцябло, якое ўецца
ВЯЗКИЙ - (вкус) даўкі; (вещество) глейкі
ВЯЗКОСТЬ - вязкасць, глейкасць
В. ПРОТОПЛАЗМЫ - в. пратаплазмы

Г

ГАБИТУС - габітус, -су
ГАЗ - газ, -зу
ГАЗ УГАРНЫЙ - газ чадны
Г. УГЛЕКИСЛЫЙ - г. вуглякіслы

ГАЗОВАЯ ГОРЕЛКА - газоўка, г. агнёўка
ГАЗООБМЕН – газаабмен, -ну
ГАЗООБРАЗНОЕ СОСТОЯНИЕ - газападобны стан, -ну
ГАЗОПРОНИЦАЕМОСТЬ - газапранікальнасць
ГАЗОСОДЕРЖАНИЕ (вмещать, заключать) - газазмяшчэнне; (действие)-газаўтрыманне
ГАЗОУСТОЙЧИВОСТЬ - газаўстойлівасць
ГАЛАКТОЗА - галактоза
ГАЛАКТОЛИПИД - галакталіпід, -ду
ГАЛАКТУРОНОВАЯ КИСЛОТА - галактуронавая кіслата
ГАЛЛ - гал, -ла; цэцыдый, -ыя
ГАЛОФИТ - галафіт, -ту
ГАЛОФОБ - галафоб, -ба
ГАМЕТА - гамета
ГАМЕТОГЕНЕЗ - гаметагенез, -зу
ГАМЕТОФИТ - гаметафіт, -ту
ГАММА-ЛУЧИ - гама-прамяні
ГАПЛОИД - гаплоід, -да
ГАУСТОРИЯ - гаўсторыя
ГАШЁНАЯ ИЗВЕСТЬ - гашаная вапна
ГЕКСОЗА - гексоза
ГЕКСОКИНАЗА - гексакіназа
ГЕЛИЙ - гелій, -ію; гель, -лю
ГЕЛИОТРОПИЗМ - геліятрапізм, -му
ГЕЛИОФИТ - геліяфіт, -ту
ГЕЛЬ - жэль, -лю
ГЕЛЬ-ЭЛЕКТРОФОРЕЗ - жэль-электрафарэз, -зу
ГЕМ - гем, -му
ГЕМОГЛОБИН - гемаглабін, -ну
ГЕМОПРОТЕИД - гемапратэід, -ду
ГЕН - ген, -на
ГЕНЕАЛОГИЯ - генеалогія
ГЕНЕЗИС - генезіс, -су
ГЕНЕРАТИВНЫЙ - генератыўны
ГЕНЕРАЦИЯ - генерацыя
ГЕНЕТИКА - генетыка
ГЕНЕТИЧЕСКАЯ ИНЖЕНЕРИЯ - генетычная інжынерыя
ГЕНЕТИЧЕСКИЙ КОД - генетычны код, -да
ГЕНОМ - геном, -му
ГЕНОТИП - генатып, -па
ГЕНОФОНД - генафонд, -ду
ГЕОБОТАНИКА - геабатаніка
ГЕОГРАФИЯ РАСТЕНИЙ - геаграфія раслін
ГЕОМОРФОЗ - геамарфоз, -зу
ГЕОТАКСИС - геатаксіс, -су
ГЕОТРОПИЗМ - геатрапізм, -му
ГЕРБИЦИД - гербіцыд, -ду
ГЕРМАФРОДИТ - гермафрадыт, -та
ГЕТЕРОАУКСИН - гетэрааўксін, -ну
ГЕТЕРОГЕННЫЙ - гетэрагенны
ГЕТЕРОЗИГОТНЫЙ - гетэразіготны
ГЕТЕРОЗИС - гетэрозіс, -су
ГЕТЕРОСТИЛИЯ - гетэрастылія
ГЕТЕРОТРОФ - гетэратроф, -фу
ГЕТЕРОТРОФНОСТЬ - гетэратрофнасць
ГЕТЕРОФИЛЛИЯ - гетэрафілія
ГЕТЕРОХРОМАТИН - гетэрахраматын, -ну
ГЕТЕРОЦИКЛИЧЕСКИЙ - гетэрацыклічны
ГИАЛОДЕРМА - гіяладэрма
ГИАЛОПЛАЗМА - гіялаплазма
ГИББЕРЕЛЛИН - гіберэлін, -ну
ГИБЕЛЬ - гібель, пагібель
ГИБРИД - гібрыд, -да
ГИБРИДИЗАЦИЯ - гібрыдызацыя
ГИГРОСКОПИЧЕСКАЯ ВЛАГА - гіграскапічная вільгаць
ГИГРОСКОПИЧНОСТЬ - гіграскапічнасць
ГИГРОФИЛ - гіграфіл, -ла

ГИГРОФИТ - гіграфіт, -та
ГИГРОФОБ - гіграфоб, -ба
ГИДАТОДА - гідатода
ГИДРАТАЦИЯ - гідратацыя
ГИДРАТУРА - гідратура
ГИДРИРОВАНИЕ - гідраванне
ГИДРОАКТИВНОЕ ДВИЖЕНИЕ УСТЬИЦ - гідраактыўны рух вусцейкаў
ГИДРОГЕНАЗА - гідрагеназа
ГИДРОКСИД - гідраксід, -ду
ГИДРОКСИЛАМИН - гідраксіламін, -ну
ГИДРОКСИЛИРОВАНИЕ - гідраксіляванне
ГИДРОКСИЛЬНАЯ ГРУППА - гідраксільная група
ГИДРОЛАЗА - гідралаза
ГИДРОЛИЗ - гідроліз, -зу
ГИДРОЛИТИЧЕСКАЯ ДИССОЦИАЦИЯ - гідралітычная дысацыяцыя
ГИДРОМОРФОЗ - гідрамарфоз, -зу
ГИДРОПАССИВНОЕ ДВИЖЕНИЕ УСТЬИЦ - гідрапасіўны рух вусцейкаў
ГИДРОПОНИКА - гідрапоніка
ГИДРОСТАТИЧЕСКОЕ ДАВЛЕНИЕ - гідрастатычны ціск, -ку
ГИДРОТРОПИЗМ - гідратрапізм,-му
ГИДРОФИЛИЯ - гідрафілія
ГИДРОФИЛЬНЫЙ - гідрафільны
ГИДРОФИТ - гідрафіт, -та
ГИДРОФОБНОСТЬ - гідрафобнасць
ГИНЕЦЕЙ - гінецэй
ГИПЕРТОНИЧЕСКИЙ РАСТВОР - гіпертанічны раствор (рашчына)
ГИПОДЕРМА - гіпадэрма
ГИПОКОТИЛЬ - гіпакатыль, -ля
ГИПОКСАНТИН - гіпаксантын, -ну
ГИПОНАСТИЯ - гіпанастыя
ГИПОТЕЗА - гіпотэза
ГИПОТОНИЧЕСКИЙ - гіпатанічны
ГИПОФИЗ - гіпофіз, -за
ГИСТИДИН - гістыдын, -ну
ГИСТОГЕНЕЗ - гістагенез, -зу
ГИСТОГРАММА - гістаграма
ГИСТОЛОГИЯ - гісталогія
ГИСТОН - гістон, -ну
ГИСТОХИМИЯ - гістахімія
ГИФА - гіфа
ГЛАВНЫЙ КОРЕНЬ - галоўны корань, -ня
ГЛИКОГЕН - глікаген, -ну
ГЛИКОЗИД - гліказід, -ду
ГЛИКОЛАТ - глікалат, -ту
ГЛИКОЛАТОКСИДАЗА - глікалатаксідаза
ГЛИКОЛЕВАЯ КИСЛОТА - гліколевая кіслата
ГЛИКОЛИЗ - гліколіз, -зу
ГЛИКОЛИПИД - глікаліпід, -ду
ГЛИКОПРОТЕИД - глікапратэід, -ду
ГЛИОКСИЛАТНЫЙ ЦИКЛ - гліяксілатны цыкл, -ла
ГЛИОКСИСОМА - гліяксісома
ГЛИЦЕРИД - гліцэрыд, -ду
ГЛИЦЕРИН - гліцэрына
ГЛИЦЕРИНОВЫЙ АЛЬДЕГИД - гліцэрынавы альдэгід, -ду
ГЛИЦЕРОФОСФАТ - гліцэрафасфат, -ту
ГЛИЦИН - гліцын, -ну
ГЛОБУЛИН - глабулін, -ну
ГЛОБУЛЯРНЫЙ БЕЛОК - глабулярны бялок, -лку
ГЛУБОКИЙ ПОКОЙ - глыбокі сп[illegible]й
ГЛУТАМАТДЕГИДРОГЕНАЗА - глутаматдэгідрагеназа
ГЛУТАМИН - глутамін, -ну
ГЛУТАМИНОВАЯ КИСЛОТА - глутамінавая кіслата
ГЛУТАТИОН - глутатыён, -ну

ГЛЮКОЗА - глюкоза
ГЛЮКОЗОФОСФАТ - глюкозафасфат, -ту
ГЛЮКОНЕОГЕНЕЗ - глюканеагенез, -зу
ГЛЮКУРОНОВАЯ КИСЛОТА - глюкуронавая кіслата
ГЛЮТАМИН - глютамін, -ну
ГНЕЗДО - гняздо
Г. ЗАВЯЗИ - г. завязі
Г. ПЫЛЬНИКА - г. пыльніка
ГНИЕНИЕ - гніенне, гніццё
ГНИЛОСТНЫЕ БАКТЕРИИ - гніласныя бактэрыі
ГНИЛЬ - гніль
ГОДИЧНОЕ КОЛЬЦО - гадавое кольца
ГОДИЧНЫЙ СЛОЙ - гадавы слой, -я
Г. РИТМ - г. рытм, -му
ГОЛОСЕМЕННЫЕ РАСТЕНИЯ - голанасенныя расліны
ГОЛУБОВАТЫЙ - блакітнаваты, блакітнявы
ГОЛУБОЙ - блакітны
ГОМЕОСТАЗ - гамеастаз, -зу
ГОМОГЕНИЗАЦИЯ - гамагенізацыя
ГОМОЙОГИДРИДНЫЙ - гамояігідрыдны
ГОМОЛОГИЧНЫЙ - гамалагічны
ГОРЕНИЕ - гарэнне
ГОРИЗОНТАЛЬНАЯ СОМКНУТОСТЬ - гарызантальная самкнутасць
ГОРМОН - гармон, -ну
ГОРМОНАЛЬНЫЙ КОМПЛЕКС - гарманальны комплекс, -су
ГОРНАЯ РАСТИТЕЛЬНОСТЬ - горная расліннасць
ГРАВИМОРФИЗМ - гравімарфізм, -му
ГРАВИТРОПИЗМ - гравітрапізм, -му
ГРАДИЕНТ - градыент, -та
ГРАДУИРОВАННАЯ БЮРЕТКА - градуяваная бюрэтка, шкаляваная б.
Г. ПИПЕТКА - г. піпетка
ГРАНА - грана
ГРИБ - грыб, -ба
ГРУППА - група
Г. АЛЬДЕГИДНАЯ - г. альдэгідная
Г. ГИДРОКСИЛЬНАЯ - г. гідраксільная
Г. КАРБОКСИЛЬНАЯ - г. карбаксільная
Г. КАРБОНИЛЬНАЯ - г. карбанільная
Г. МЕТИЛЬНАЯ - г. метыльная
Г. ПЕРОКСИДНАЯ - г. пераксідная
Г. ФЕНИЛЬНАЯ - г. фенільная
Г. ФУНКЦИОНАЛЬНАЯ - г. функцыянальная
Г. ЭЛЕКТРОН-АКЦЕПТОРНАЯ - г. электрон-акцэптарная
Г. ЭЛЕКТРОННО-ДОНОРНАЯ - г. электронна-донарная
ГРУППИРОВАНИЕ - групаванне
ГУАНИН - гуанін, -ну
ГУАНОЗИН - гуаназін, -ну
ГУБЧАТАЯ ПАРЕНХИМА - губчатая, губкаватая парэнхіма; сітаватая п.
ГУБЧАТЫЙ МЕЗОФИЛЛ - губчаты мезафіл, -лу, сітаваты м.
ГУМИНОВАЯ КИСЛОТА - гумінавая кіслата
ГУМУС - гумус, -су
ГУСТОТА ДРЕВОСТОЯ - гушчыня дрэвастою
ГУТТА - гута
ГУТТАПЕРЧА - гутаперча
ГУТТАПЕРЧЕНОСНЫЙ - гутаперчаносны
ГУТТАЦИЯ - гутацыя

Д

ДАВЛЕНИЕ - ціск, -ку
Д. ИЗБЫТОЧНОЕ - ц. залішні
Д. НАБУХАНИЯ - ц. набухання
Д. НАСЫЩЕННОГО ПАРА - ц. насычанай пары
Д. ОСМОТИЧЕСКОЕ - ц. асматычны
Д. ПАРЦИАЛЬНОЕ - ц. парцыяльны
ДАЛЬНИЙ КРАСНЫЙ СВЕТ - далёкае чырвонае святло
ДАННЫЕ ОПЫТА - даныя доследу
ДВИГАТЕЛЬНАЯ КЛЕТКА - рухальная клетка
Д. РЕАКЦИЯ - р. рэакцыя
ДВИГАТЬСЯ - рухацца
ДВИЖЕНИЕ - рух, -ху
Д. БРОУНОВСКОЕ - р. броўнаўскі
Д. ВОЛНООБРАЗНОЕ - р. хвалісты
Д. ВРАЩАТЕЛЬНОЕ - р. вярчальны
Д. РАСТЕНИЙ - р. раслін
ДВИЖУЩАЯ СИЛА - рухаючая, рухальная сіла
ДВИЖУЩИЙ - рухаючы, рухальны
ДВОЙНАЯ НОМЕНКЛАТУРА - двайная наменклатура
Д. СПИРАЛЬ - двайная спіраль
ДВОЙНОЕ ОПЛОДОТВОРЕНИЕ - двайное апладненне
ДВОЙНОЙ СУПЕРФОСФАТ - двайны (падвоены) суперфасфат, -ту
ДВОЙСТВЕННОСТЬ - двайстасць
ДВОЯКОВОГНУТЫЙ - дваякаўвагнуты
ДВУДОЛЬНЫЙ - двухдольны
ДВУДОМНЫЙ - двухдомны
ДВУЗАМЕЩЕННЫЙ - двухзамешчаны
ДВУЛЕТНИЙ - двухгадовы
ДВУЛЕТНИК - двухгадовік, -ка
ДВУОКИСЬ УГЛЕРОДА - двухвокіс вугляроду
ДВУПОЛЫЙ - двухполы
ДВУРЯДНОЕ РАСПОЛОЖЕНИЕ - двухрадовае размяшчэнне
ДВУСЕМЯНКА - двухсямянка
ДВУСТОРОННИЙ - двухбаковы
ДВУСТОРОННЯЯ СИММЕТРИЯ - двухбаковая сіметрыя
ДЕВИТРИФИКАЦИЯ - дэвітрыфікацыя
ДЕВСТВЕННЫЙ - некрануты
ДЕГЕНЕРАЦИЯ - дэгенерацыя
ДЕГИДРИРОВАНИЕ - дэгідраванне
ДЕГИДРОГЕНАЗА - дэгідрагеназа
ДЕГРАДАЦИЯ - дэградацыя
ДЕДИФФЕРЕНЦИРОВКА - дэдыферэнцаванне
ДЕЗАМИНИРОВАНИЕ - дезамінаванне
ДЕЗОКСИРИБОЗА - дэзоксірыбоза
ДЕЗОКСИРИБОНУКЛЕАЗА - дэзоксірыбануклеаза
ДЕЗОКСИРИБОНУКЛЕАТИД - дэзоксірыбануклеатыд, -ду
ДЕЗОКСИРИБОНУКЛЕИНОВАЯ КИСЛОТА (ДНК) - дэзоксірыбануклеінавая кіслата
ДЕЗОКСИСАХАРИД - дэзоксіцукрыд, -ду
ДЕЙСТВИЕ ФАКТОРА - дзеянне фактару
ДЕКАПИТАЦИЯ - дэкапітацыя
ДЕКАРБОКСИЛАЗА - дэкарбаксілаза
ДЕКАРБОКСИЛИРОВАНИЕ - дэкарбаксіляванне
ДЕКСТРИН - дэкстрын, -ну
ДЕЛЕНИЕ - дзяленне, падзел
Д. КЛЕТОК - д. клетак
Д. МИТОТИЧЕСКОЕ - д. мітатычнае

Д. НЕПРЯМОЕ (КАРИОКИНЕЗ) - д. непрамое (карыякінэз)
Д. ПРЯМОЕ - д. прамое
Д. РЕДУКЦИОННОЕ - д. рэдукцыйнае
ДЕЛИТЬСЯ - дзяліцца
ДЕЛЯЩИЙСЯ - які дзеліцца, самападзельны
ДЕНАТУРАЦИЯ - дэнатурацыя
ДЕНДРАРИЙ - дэндрарый
ДЕНИТРИФИКАЦИЯ - дэнітрыфікацыя
ДЕПЛАЗМОЛИЗ - дэплазмоліз, -зу
ДЕПОЛИМЕРИЗАЦИЯ - дэполімерызацыя
ДЕПОЛЯРИЗАЦИЯ - дэпалярызацыя
ДЕПРЕССИЯ - дэпрэсія
ДЕРЕВО - дрэва
ДЕРЕВЯНИСТЫЙ СТЕБЕЛЬ - драўністае сцябло
ДЕРЕПРЕССИЯ ГЕНОВ - дэрэпрэсія генаў
ДЕРМАТОГЕН - дэрматаген, -ну
ДЕРМАТОКАЛИПТОГЕН - дэрматакаліптаген, -ну
ДЕРНИНА - дзірван, дзёран, -рну
ДЕРНИСТЫЙ - дзірваністы, дзярновы
ДЕСОРБЦИЯ - дэсорбцыя
ДЕСТРУКТИВНЫЙ - дэструктыўны
ДЕСТРУКЦИОННЫЙ - дэструкцыйны
ДЕСТРУКЦИЯ - дэструкцыя
ДЕТЕРМИНАЦИЯ - дэтэрмінацыя
ДЕТЕРМИНИРОВАННЫЙ - дэтэрмінаваны
ДЕТОКСИКАЦИЯ - дэтаксікацыя
ДЕФЕКТ - дэфект, -ту, загана
ДЕФЕКТНЫЙ - дэфектыўны, заганны
ДЕФИЦИТ - дэфіцыт, -ту
Д. НАСЫЩЕНИЯ - д. насычэння
ДЕФОЛИАЦИЯ - дэфаліяцыя
ДЕФОРМАЦИЯ - дэфармацыя
Д. ОСТАТОЧНАЯ - д. рэштквая
Д. УПРУГАЯ - д. пруткая, пругкая
ДЕФОРМИРОВАННЫЙ - дэфармаваны
ДЕФОРМИРОВАТЬ - дэфармаваць
ДИАГНОЗ - дыягназ -зу
ДИАГНОСТИКА - дыягностыка
Д. ПИТАНИЯ - д. жыўлення
ДИАГНОСТИЧЕСКИЙ - дыягнастычны
ДИАГРАММА - дыяграма
ДИАСТАЗА - дыястаза
ДИАФРАГМА - дыяфрагма
ДИГРЕССИЯ - дыгрэсія
ДИКОРАСТУЩИЙ - дзікарослы
ДИКТИОСОМА - дыктыясома
ДИМОРФИЗМ - дымарфізм, -му
Д. ПОЛОВОЙ - д. палавы
ДИНАМИЧЕСКИЙ - дынамічны
ДИНАМИЧЕСКОЕ РАВНОВЕСИЕ - дынамічная раўнавага
ДИНУКЛЕОТИД - дынуклеатыд, -ду
ДИОКСИАЦЕТОНФОСФАТ - дыоксіацэтонфасфат, -ту
ДИОКСИД - дыаксід, -ду
ДИПЛОИД - дыплоід, -да
ДИПЛОИДНАЯ ФАЗА - дыплоідная фаза
ДИПОЛЬ - дыполь, -ля
ДИСАХАРИД - дыцукрыд, -ду
ДИСИММЕТРИЯ - дысіметрыя
ДИСК - дыск, -ка
ДИСКООБРАЗНЫЙ - дыскападобны
ДИСКРЕТНЫЙ - дыскрэтны, перарывісты
ДИСПЕРСИОННАЯ СРЕДА - дысперсійнае асяроддзе
Д. ФАЗА - д. фаза
ДИССОЦИАЦИЯ - дысацыяцыя

Д. ЭЛЕКТРОЛИТИЧЕСКАЯ -
д. электралітычная
ДИССОЦИИРОВАННЫЙ -
дысацыяваны
ДИСТАЛЬНЫЙ - дыстальны
ДИСТАНЦИОННЫЙ МЕТОД -
дыстанцыйны метад, -ду
ДИСТИЛЛИРОВАННАЯ ВОДА -
дыстыляваная вада
ДИСУЛЬФИДНАЯ СВЯЗЬ -
дысульфідная сувязь
ДИСУЛЬФИДНЫЙ МОСТИК -
дысульфідны мосцік, -ка; масток,-тка
ДИТЕРПЕНОИД - дытэрпеноід, -ду
ДИФФЕРЕНЦИАЛЬНАЯ
АКТИВНОСТЬ ГЕНОВ -
дыферэнцыяльная актыўнасць генаў
ДИФФЕРЕНЦИАЛЬНЫЙ СПЕКТР -
дыферэнцыяльны спектр, -ра
ДИФФЕРЕНЦИАЦИЯ -
дыферэнцыяцыя
ДИФФЕРЕНЦИРОВКА -
дыферэнцыроўка
ДИФФУЗИОННЫЙ БАРЬЕР -
дыфузійны бар'ер, -ру
ДИФФУЗИЯ - дыфузія
ДИФФУНДИРОВАТЬ - дыфундаваць
ДЛИНА - даўжыня
ДЛИННОДНЕВНОЕ РАСТЕНИЕ -
доўгадзённая расліна
ДЛИННОКОРНЕВИЩНЫЙ ЗЛАК -
доўгакарэнішчавы злак
ДНЕВНОЙ ХОД ТРАНСПИРАЦИИ-
дзённы ход транспірацыі
ДНИЩЕ - днішча
ДНК-полимераза - ДНК-полімераза
ДОБАВКА - дабаўленне
ДОБАВОЧНАЯ ПОЧКА -
дадатковая пупышка
ДОЗИРОВАНИЕ - дазаванне
ДОЗИРОВКА - дазаванне
ДОЗРЕВАНИЕ СЕМЯН - даспяванне
насення
ДОЛОМИТ - даламіт, -ту
ДОЛОМИТОВАЯ МУКА -
даламітавая мука
ДОМЕСТИКАЦИЯ - дамэстыкацыя
ДОМИНАНТНЫЙ - дамінантавы
ДОМИНИРОВАНИЕ - дамінаванне
ДОНОР - донар, -ра
ДОНОРНО-АКЦЕПТОРНАЯ СВЯЗЬ
- донарна-акцэптарная сувязь
ДОНЦЕ - донца, днечка
ДОПОЛНИТЕЛЬНЫЙ - дадатковы
ДОПОЛНИТЬ ДО МЕТКИ -
дапоўніць да меткі, рыскі
ДОРСАЛЬНЫЙ - дарсальны
ДОРСОВЕНТРАЛЬНЫЙ -
дорсавентральны
ДОСТУПНАЯ ВЛАГА - даступная
вільгаць
ДОЧЕРНИЙ - дачыны
ДОЧЕРНЯЯ ЛУКОВИЦА - дачынэ
цыбуліна
ДОЯДЕРНЫЙ -даядзерны
ДРЕВЕСИНА - драўніна
Д. ВТОРИЧНАЯ - д. другасная
Д. ЗАБОЛОННАЯ - д. забалонная
Д. КОЛЬЦЕСОСУДИСТАЯ -
д. кольцасасудзістая
Д. ПЕРВИЧНАЯ - д. першасная
Д. ПОЗДНЯЯ - д. позняя
Д. РАННЯЯ - д. ранняя
Д. РАССЕЯННО-СОСУДИСТАЯ -
д. рассеяна-сасудзістая
ДРЕВЕСНЫЙ - драўняны
ДРЕВНИЙ - старажытны
ДРЕВОВИДНЫЙ - дрэвападобны,
дрэвавы
ДРЕВОСТОЙ - дрэвастой, -ою
ДРЕНАЖ - дрэнаж, -жу
ДРОЖЖИ - дрожджы
ДРУЗА - друза

ДУБИЛЬНЫЕ ВЕЩЕСТВА - гарбавальныя рэчывы, гарбнік
ДУБЛЕНИЕ - дубленне, гарбаванне
ДЫХАНИЕ - дыханне
Д. ВНЕШНЕЕ - д. знешняе
Д. ТКАНЕВОЕ - д. тканкавае
ДЫХАТЕЛЬНАЯ ПОЛОСТЬ - дыхальная поласць
ДЫХАТЕЛЬНЫЙ - дыхальны
Д. ГАЗООБМЕН - д. газаабмен, -ну
Д. КОЭФФИЦИЕНТ - д. каэфіцыент, -та
Д. ПИГМЕНТ - д. пігмент, -ту
Д. ФЕРМЕНТ - д. фермент, -ту

Е

ЕДИНИЦА ИЗМЕРЕНИЯ - адзінка вымярэння
ЕДИНСТВО - адзінства
ЕДКИЙ КАЛИЙ - едкі каль, -ю; калій, -ію
Е. НАТР - е. натр, -у; натрый, -ыю
ЕЛЬ ОБЫКНОВЕННАЯ - елка звычайная
ЕЛЬНИК - ельнік, -ку
ЕМКОСТЬ БУФЕРНАЯ РАСТВОРА - ёмістасць буферная раствору
ЕНОЛ - енол, -лу
ЕСТЕСТВЕННАЯ СИСТЕМА КЛАССИФИКАЦИИ - натуральная сістэма класіфікацыі
ЕСТЕСТВЕННОЕ ИЗРЕЖИВАНИЕ - натуральнае зрэджванне, разрэджванне
ЕСТЕСТВЕННЫЙ - натуральны, прыродны
Е. ОТБОР - натуральны адбор, -ру
ЕСТЕСТВОЗНАНИЕ - прыродазнаўства
ЕСТЕСТВОИСПЫТАТЕЛЬ - даследчык прыроды, прыродазнаўца, натураліст

Ж

ЖАРОВЫНОСЛИВОСТЬ - гарачавыносліваспь
ЖАРОУСТОЙЧИВОСТЬ - гарачаўстойлівасць
ЖГУТИК - жгуцік
ЖГУЧИЙ - пякучы
ЖЕЛАТИН - жэлаціна, -ны
ЖЕЛЕЗА - залоза
ЖЕЛЕЗИСТЫЙ - залозісты
Ж. ВОЛОСОК - з. валасок
ЖЕЛЕЗКА - залозка
ЖЕЛЕЗНЫЙ КУПОРОС - жалезны купарвас, -су
ЖЕЛЕЗО - жалеза
ЖЕЛЕЗОБАКТЕРИИ - жалезабактэрыи
ЖЕЛЕЗОПРОТЕИД - жалезапратэід, -ду
ЖЕНСКИЙ ЦВЕТОК - жаночая кветка
ЖЕЛУДЬ - жолуд, -да
ЖИВИЦА - жывіца
ЖИВИЧНЫЙ СКИПИДАР - жывічны шкіпінар, -ру
ЖИВОТНОЕ - жывёла, (одна)— жывёліна
ЖИДКИЙ - вадкі

ЖИДКОЕ СОСТОЯНИЕ - вадкі стан, -ну
ЖИДКОСТЬ - вадкасць
ЖИЗНЕДЕЯТЕЛЬНОСТЬ - жыццядзейнасць
ЖИЗНЕННАЯ ФОРМА - жыццёвая форма
ЖИЗНЕННОСТЬ - жыццёвасць
ЖИЗНЕННЫЙ ЦИКЛ - жыццёвы цыкл, -ла
ЖИЗНЕСПОСОБНОСТЬ - жыццяздольнасць
ЖИЗНЕСПОСОБНОСТЬ СЕМЯН - жыццяздольнасць насення
ЖИЛКА - жылка
ЖИЛКОВАНИЕ - жылкаванне
Ж. ЛИСТА - жылка ліста
ЖИР - тлушч, -чу
ЖИРНЫЕ КИСЛОТЫ - тлустыя кіслоты
ЖИРОВОЙ ОБМЕН - тлушчавы абмен, -ну
ЖИРООБРАЗОВАНИЕ - тлушчаўтварэнне
ЖИРОВАТЬ - буяць
ЖИРОВЫЕ ПОБЕГИ - буйныя парасткі
ЖИРОРАСТВОРИМЫЙ - тлушчарастваральны
ЖУРНАЛ - журнал, -ла; часопіс, -са
Ж. ЛАБОРАТОРНЫЙ - журнал лабараторны
Ж. ФИЗИОЛОГИЧЕСКИЙ - часопіс фізіялагічны

З

ЗАБОЛАЧИВАНИЕ - забалочванне
ЗАБОЛЕВАНИЕ - захворванне
ЗАБОЛОНЬ - абалона
ЗАВЕРНУТЫЙ - загорнуты
ЗАВЯДАТЬ - вянуць,завядаць
ЗАВЯЗЬ - завязь
ЗАГИБАНИЕ - загінанне
ЗАГНИВАТЬ - загніваць
ЗАГРЯЗНЕНИЕ - забруджванне
ЗАГУСТЕВАТЬ - загусаць, гусцець
ЗАГУЩЕННЫЙ - загушчаны
ЗАДЕРЖИВАТЬ - затрымліваць
ЗАДЕРНЕНИЕ - здзірваненне
ЗАЖИВЛЕНИЕ - загойванне, гаенне
ЗАЖИМ - заціск, -ка; заціскачка
ЗАЖИМАТЬ - заціскаць
ЗАКАЛИВАНИЕ - загартоўванне
ЗАКАЛКА - гартаванне, загартоўка, гарт, -ту
ЗАКВАСКА - закваска
ЗАКИСЬ - закіс, -су
ЗАКОН - закон, -ну
З. ВОЗВРАТА - з. вяртання
З. КОЛИЧЕСТВА РАЗДРАЖЕНИЯ - з. колькасці раздражнення
З. МИНИМУМА - з. мінімуму
З. ОГРАНИЧИВАЮЩИХ ФАКТОРОВ - з. абмежавальных фактараў
З. УБЫВАЮЩЕГО ПЛОДОРОДИЯ - з. змяншэння ўрадлівасці
ЗАКРЕПЛЕНИЕ - замацаванне, замацоўванне
ЗАКУПОРКА - затыканне, закаркоўка, закаркоўванне
ЗАМАЧИВАНИЕ - замочванне
ЗАМЕДЛЯТЬ - запавольваць, замаруджваць
ЗАМЕНИМАЯ АМК - заменная АМК
ЗАМЕЩЕНИЕ - замяшчэнне
ЗАМКНУТАЯ СИСТЕМА - замкнёная сістэма
ЗАМОРАЖИВАНИЕ - замарожванне

ЗАМЫКАЮЩИЕ КЛЕТКИ - замыкальныя клеткі
ЗАПАЛ РАСТЕНИЙ - запал раслін
ЗАПАС БИОЛОГИЧЕСКОЙ ПРОДУКЦИИ - запас біялагічнай прадукцыі
З. ДРЕВЕСИНЫ - з. драўніны
ЗАПАСАЮЩАЯ ПАРЕНХИМА - назапашвальная парэнхіма
ЗАПАСАЮЩАЯ ТКАНЬ - назапашвальная тканка
ЗАПАСАЮЩИЕ КОРНИ - назапашвальныя карані
З. ОР НЫ - з. органы
ЗАПАСАЮЩИЙ - назапашвальны
ЗАПАСНОЙ КРАХМАЛ - запасны крухмал, -лу
ЗАПАСНЫЕ ВЕЩЕСТВА - запасныя рэчывы
ЗАПАХ - пах, - ху
ЗАПРОГРАММИРОВАННЫЙ - запраграмаваны
ЗАРАЖЕНИЕ - заражэнне
ЗАРОДЫШ - зародак, -дка
ЗАРОДЫШЕВЫЕ КЛЕТКИ - зародкавыя клеткі
ЗАРОСТОК - заростак, -тка
ЗАРОСШИЙ - зарослы
ЗАРЯД - зарад, -ду
З. ПОЛОЖИТЕЛЬНЫЙ - з. дадатны
З. ОТРИЦАТЕЛЬНЫЙ - з. адмоўны
ЗАРЯЖАТЬ - зараджаць
ЗАСАСЫВАТЬ - засмоктваць
ЗАСОЛЕНИЕ - засольванне
З. ПОЧВЫ - з. глебы
ЗАСУХОУСТОЙЧИВОСТЬ - засухаўстойлівасць
ЗАСУШЛИВАЯ ЗОНА - засушлівая зона
ЗАТВЕРДЕВАНИЕ - зацвердзяванне
ЗАТВЕРДЕВШИЙ - зацвярдзелы
ЗАТЕНЕНИЕ - зацяненне
ЗАТЕНЕННЫЙ - зацэнены
ЗАТРУДНЕНИЕ - цяжкасць
ЗАТУХАНИЕ - затуханне, загасанне
ЗАФИКСИРОВАННЫЙ - зафіксаваны
ЗАХВАТ - захоп, -пу
ЗАХВАТЫВАТЬ - захопліваць
ЗАЦВЕТАНИЕ - зацвітанне
ЗАЧАТИЕ - зачацце
ЗАЧАТОК - зачатак, -тка
ЗАЧАТОЧНЫЙ - зачаткавы
З. КОРЕШОК - з. карэньчык, -ка
З. СТЕБЕЛЬ - зачаткавае сцябло
ЗАЩИТА - ахова, абарона
З. РАСТЕНИЙ - ахова раслін
ЗЕАКСАНТИН - зеаксантын, -ну
ЗЕАТИН - зеатын, -ну
ЗЕИН - зеін, -ну
ЗЕЛЕНАЯ ПАРЕНХИМА - зялёная пар хіма
ЗЕЛЕНОЕ УДОБРЕНИЕ - зялёнае ўгнаенне
ЗЕЛЕНЫЙ ЧЕРЕНОК - зялёны чаранок, -нка
ЗЕМЛЕДЕЛИЕ - земляробства
ЗЕРКАЛО - люстра, люстэрка
ЗЕРКАЛЬНОЕ ОТРАЖЕНИЕ - люстраны адбітак, -тка
ЗЕРНО - зерне
ЗЕРНОВКА - зярноўка
ЗЕРНЫШКО - зярнятка
ЗИГОТА - зігота
ЗИМНЕЗЕЛЕНЫЙ - зімнезялёны
ЗИМОВКА РАСТЕНИЙ - зімоўка раслін, зімаванне
ЗИМОГЕН - зімаген, -ну
ЗИМОСТОЙКОСТЬ - зімаўстойлівасць
ЗИМУЮЩИЕ ПОЧКИ - зімуючыя пупышкі, зімавальныя п.
ЗИМУЮЩИЙ - зімуючы, які зімуе, зімавальны

ЗОЛА - попел, -лу
ЗОЛЬ - золь, золю
ЗОЛЬНОСТЬ - попельнасць, зольнасць
ЗОЛЬНЫЕ ВЕЩЕСТВА - зольныя рэчывы
ЗОНА - зона
З. ВЕТВЛЕНИЯ - з. галінавання
З. ВСАСЫВАНИЯ - з. усмоктвання
З. ДЕЛЕНИЯ - з. дзялення, падзелу
З. КОРНЕВЫХ ВОЛОСКОВ - з. каранёвых валаскоў
З. НЕУСТОЙЧИВОГО УВЛАЖНЕНИЯ - з. няўстойлівага ўвільгатнення
З. ПРОВЕДЕНИЯ - з. правядзення
З. РАСТЯЖЕНИЯ - з. расцяжэння
ЗОНАЛЬНАЯ РАСТИТЕЛЬНОСТЬ - занальная расліннасць
ЗРЕЛОЕ СОСТОЯНИЕ - сталы, спелы стан, -ну
ЗРЕЛОСТЬ - спеласць

И

ИВА - вярба
ИВАНОВЫ ПОБЕГИ - Іванавы парасткі, заўчасныя парасткі
ИГЛОВИДНЫЙ - іголкападобны
ИГЛООБРАЗНЫЙ - іголкападобны
ИДЕНТИФИКАЦИЯ - ідэнтыфікацыя
ИДЕНТИЧНЫЙ - ідэнтычны
ИДИОСОМА - ідыясома
ИЕРАРХИЯ - іерархія
ИЗБИРАТЕЛЬНАЯ ПРОНИЦАЕМОСТЬ - выбіральная пранікальнасць
ИЗБИРАТЕЛЬНОСТЬ - выбіральнасць
ИЗБЫТОК - лішак, -шку
ИЗБЫТОЧНОЕ ДАВЛЕНИЕ - залішні (празмерны) ціск, -ку
ИЗВЕСТКОВАНИЕ - вапнаванне
ИЗВЕСТНЯК - вапняк, -ку
ИЗВЕСТЬ - вапна
ИЗГИБАТЬСЯ - выгінацца, выгібацца
ИЗГОТОВЛЯТЬ - вырабляць
ИЗЛИШЕК - лішак, -шку
ИЗЛУЧЕНИЕ (процесс) - выпраменьванне, выпрамяненне, прамяненне; (явление)-прамяніва
ИЗМЕЛЬЧАТЬ - здрабняць, крышыць
ИЗМЕЛЬЧЕНИЕ - здрабненне
ИЗМЕНЧИВОСТЬ - зменлівасць
И. АДАПТИВНАЯ - з. адаптыўная
И. АДЕКВАТНАЯ - з. адэкватная
И. ВНУТРИВИДОВАЯ - з. унутрывідавая
И. ВОЗРАСТНАЯ - з. узроставая
И. ГЕНОТИПИЧЕСКАЯ - з. генатыпічная
И. ИНДИВИДУАЛЬНАЯ - з. індывідуальная
И. МОДИФИКАЦИОННАЯ - з. мадыфікацыйная
И. НАСЛЕДСТВЕННАЯ - з. спадчынная
И. НЕНАСЛЕДСТВЕННАЯ - з. няспадчынная
И. САМОПРОИЗВОДНАЯ - з. самаадвольная
И. ФЕНОТИПИЧЕСКАЯ - з. фенатыпічная
ІЗМЕНЯТЬСЯ - змяняцца
ИЗМЕРЕНИЕ - мераванне, вымярэнне
ИЗМЕРИТЕЛЬНАЯ ПИПЕТКА - вымяральная, вымерная піпетка

ИЗНОСОСТОЙКОСТЬ - зносастойкасць
ИЗОДИАМЕТРИЧЕСКИЙ - ізадыяметрычны
ИЗОЛЕЙЦИН - ізалейцын, -ну
ИЗОЛИРОВАННЫЙ - ізаляваны
ИЗОЛИРОВАТЬ - ізаляваць
ИЗОЛЯЦИЯ - ізаляцыя
ИЗОМЕРАЗЫ - ізамеразы
ИЗОМЕРИЯ - ізамерыя
ИЗОМЕТРИЯ - ізаметрыя
ИЗООСМОТИЧЕСКИЙ - ізаасматычны
ИЗОП[illegible]Н - ізапрэн, -ну
ИЗОПРЕНОИД - ізапрэноід, -ду
ИЗОТОНИЧЕСКАЯ ЖИДКОСТЬ - ізатанічная вадкасць
ИЗОТОНИЯ - ізатанія
ИЗОФЕРМЕНТ - ізафермент, -ту
ИЗОЦИТРАТ - ізацытрат, -ту
ИЗОЭЛЕКТРИЧЕСКАЯ ТОЧКА - ізаэлектрычны пункт
ИЗРЕЖЕННЫЙ - зрэджаны
ИЗРЕЖИВАНИЕ - зрэджванне
ИЛ - глей, -ю
ИЛИСТЫЙ - глеяваты
ИМИНОКИСЛОТА - імінакіслата
ИММЕРСИОННЫЙ - імерсійны
ИММЕРСИЯ - імерсія
ИММОБИЛИЗАЦИЯ - імабілізацыя
ИММУНИТЕТ - імунітэт, -ту
ИМПЛАНТАЦИЯ - імплантацыя
ИМПУЛЬСНАЯ СПЕКТРОФОТОМЕТРИЯ - імпульсная спектрафотаметрыя
ИММУННЫЙ – імунны
ИНАКТИВАЦИЯ - інактывацыя
ИНБРИДИНГ - інбрыдынг, -гу
ИНВАГИНАЦИЯ - [illegible]вагінацыя
ИНВАЗИЯ - інвазія
ИНВЕРСИЯ - інверсія
ИНВЕРТАЗА - інвертаза
ИНГИБИРОВАНИЕ - інгібаванне
ИНГИБИТОР - інгібітар, -ру
И. РОСТА - і. росту
И. ЦВЕТЕНИЯ - і. цвіцення
И. ЭНДОГЕННЫЙ - і. эндагенны
ИНГРЕДИЕНТ - інгрэдыент, -ту
ИНДЕКС - індэкс, -са
И. ВСТРЕЧАЕМОСТИ - і. сустракальнасці
ИНДИВИДУАЛЬНЫЙ - індывідуальны
ИНДИВИДУУМ - індывідуум, -ма
ИНДИКАТОР - індыкатар, -ра
ИНДИКАТОРНОЕ РАСТЕНИЕ - індыкатарная расліна
ИНДИФФЕРЕНТНЫЙ - індыферэнтны
ИНДОЛИЛМАСЛЯНАЯ КИСЛОТА - індалілалейная кіслата
ИН[illegible]ОЛИЛПИРОВИНОГРАДНАЯ КИСЛОТА - індалілпіравінаградная кіслата
ИНДОЛИЛУКСУСНАЯ КИСЛОТА - індалілвоцатная кіслата
ИНДУКТИВНЫЙ - індуктыўны
ИНДУКЦИЯ - індукцыя
ИНДУЦИРОВАННЫЙ - індукаваны
И. ПОКОЙ - і. спакой, -ою
И. ФЕРМЕНТ - і. фермент, -ту
ИНДУЦИРУЮЩИЙ ФАКТОР - індукавальны фактар, -ру
ИНИЦИАЛЬНАЯ КЛЕТКА - ініцыяльная, зачынальная клетка
ИНИЦИАЦИЯ - ініцыяцыя, зачын, -ну
ИНИЦИИРОВАНИЕ - ініцыяванне, зачынанне
ИНКРУСТИРОВАННЫЙ - інкруставаны
ИНКУБАЦИОННЫЙ ПЕРИОД - інкубацыйны перыяд, -ду
ИНКУБАЦИЯ - інкубацыя

ИННЕРВАЦИЯ ЛИСТА - інервацыя ліста
ИНОЗИТ - іназіт, -ту
ИНОКУЛЯЦИЯ - інакуляцыя
ИНСЕКТИЦИД - інсектыцыд, -ду
ИНСОЛЯЦИЯ - інсаляцыя
ИНСТИНКТ - інстынкт, -ту
ИНТЕГРАЦИЯ - інтэграцыя
ИНТЕГУМЕНТ - інтэгумент, -ту
ИНТЕНСИВНАЯ КУЛЬТУРА - інтэнсіўная культура
ИНТЕНСИВНОСТЬ - інтэнсіўнасць
И. ДЫХАНИЯ - і. дыхання
И. ТРАНСПИРАЦИИ - і. транспірацыі
И. ФОТОСИНТЕЗА - і. фотасінтэзу
ИНТЕНСИВНЫЙ АГРОФИТОЦЕНОЗ - інтэнсіўны аграфітацэноз, -зу
ИНТЕРВАЛ - інтэрвал, -лу
ИНТЕРКАЛЯРНЫЙ - інтэркалярны
ИНТЕРФАЗА - інтэрфаза
ИНТЕРФЕРЕНЦИОННАЯ МИКРОСКОПИЯ - інтэрферэнцыйная мікраскапія
ИНТЕРФЕРЕНЦИЯ - інтэрферэнцыя
ИНТЕРЦЕЛЮЛЯРНЫЙ - інтэрцэлюлярны
ИНТИНА - інтына
ИНТОКСИКАЦИЯ - інтаксікацыя
ИНТРАЗОНАЛЬНАЯ РАСТИТЕЛЬНОСТЬ - інтразанальная расліннасць
ИНТРАМОЛЕКУЛЯРНОЕ ДЫХАНИЕ - інтрамалекулярнае дыханне
ИНТРОДУКЦИЯ - інтрадукцыя
ИНУЛИН - інулін, -ну
ИНФЕКЦИОННЫЙ - інфекцыйны
ИНФИЛЬТРАЦИЯ - інфільтрацыя
ИНФОРМАЦИЯ - інфармацыя
ИНФРАКРАСНЫЙ - інфрачырвоны
ИНЦУХТ - інцухт, -ту
ИОД - ёд, -ду
ИОН - іон, -на (іён, -на)
ИОНИЗИРОВАТЬ – іанізаваць (іянізаваць)
ИОНИЗИРУЮЩИЙ – іанізуючы, іанізавальны (іянізавальны)
ИОННАЯ СВЯЗЬ – іонная (іённая) сувязь
ИОННЫЙ КАНАЛ - іонны (іённы) канал, -ла
И. НАСОС - іонная (іённая) помпа
ИОНОВОЕ КОЛЬЦО - іонавае (іёнавае) кольца
ИОНОФОР - іонафор, -ру (іёнафор, -ру)
ИСКУССТВЕННОЕ ОПЫЛЕНИЕ - штучнае апыленне
И. НАСАЖДЕНИЕ - штучная пасадка, насаджэнне
ИСКУССТВЕННЫЙ ОТБОР - штучны адбор, -ру
ИСПАРЯЕМОСТЬ - выпаральнасць
ИСПОЛЬЗОВАНИЕ - выкарыстанне, скарыстанне, ужыванне
ИСПЫТАНИЕ - выпрабаванне
ИССЛЕДОВАНИЕ - даследаванне
ИССЛЕДОВАТЬ - даследаваць
ИСТИННЫЙ ФОТОСИНТЕЗ - сапраўдны фотасінтэз, -зу
ИСТОЩЕНИЕ - знясіленне
ИСТРЕБЛЕНИЕ - знішчэнне, вынішчэнне
ИСХОДНЫЙ - зыходны
ИСЧЕЗАЮЩИЙ - знікальны
ИСЧЕРПЫВАЕМЫЙ – вычэрпваемы
ИСЧЕРПЫВАНИЕ - вычэрпванне
ИСЧЕРПЫВАЮЩЕ - вычарпальна
ИСЧЕРПЫВАЮЩИЙ - вычарпальны
ИУК-оксидаза - ІВК аксідаза

К

КАЖУЩЕЕСЯ ПРОСТРАНСТВО - уяўная прастора
КАЛИЕВЫЙ - каліевы, калевы
КАЛИЙ - калій, -ію (каль, -лю)
КАЛИЙНАЯ СОЛЬ - калійная, калевая соль
КАЛИПТРОГЕН - каліптраген, -ну
КАЛЛОЗА - калоза
КАЛЛУС - калус, -су
К. РАНЕВОЙ – калус ранавы
КАЛЛУСООБРАЗОВАНИЕ - калусаўтварэнне
КАЛОРИМЕТРИЯ - каларыметрыя, цепламетрыя
КАЛОРИЯ - калорыя
КАЛЬЦЕФИЛ - кальцэфіл, -лу
КАЛЬЦЕФОБ - кальцэфоб, -бу
КАЛЬЦИЙ - кальцый, -цыю (кальц, -цу)
КАМБИАЛЬНАЯ ЗОНА - камбіяльная зона
КАМБИАЛЬНОЕ КОЛЬЦО - камбіяльнае кольца
КАМБИЙ - камбій, -ію
К. ВНЕПУЧКОВЫЙ - к. пазапучковы
К. ДОБАВОЧНЫЙ - к. дадатковы
К. КОРНЯ - к. кораня
К. МЕЖПУЧКОВЫЙ - к. міжпучковы
К. СТЕБЛЯ - к. сцябла
КАМБИФОРМ - камбіформ, -му
КАМЕДЕНОСНЫЙ - камедзяносны
КАМЕДЕТЕЧЕНИЕ - камедзецячэнне
КАМЕДЬ - камедзь, -дзі
КАМЕНИСТАЯ ТКАНЬ - каменістая тканка
К. КЛЕТКА - к. к[illegible]ка
КАМЕРАЛЬНЫЙ - камеральны
КАНАЛИЗАЦИЯ РАЗВИТИЯ - каналізацыя развіцця
КАНИФОЛЬ - каніфоль, -лі
КАП - кап, – пу
КАПЕЛЬНИЦА - кропельніца
КАПЕЛЬНОЖИДКИЙ - кропельнавадкі
КАПИЛЛЯР - капіляр, -ра

КАРАНДАШ ПО СТЕКЛУ - алоўак для шкла; шклограф, -фа
КАРБОАНГИДРАЗА - карбаангідраза
КАРБОГИДРАЗА - карбагідраза
КАРБОКСИЛИРОВАНИЕ - карбаксіляванне
КАРБОНОВАЯ КИСЛОТА - карбонавая кіслата
КАРИОКИНЕЗ - карыякінез, -зу
КАРИОЛИМФА - карыялімфа
КАРИОЛОГИЯ - карыялогія
КАРИОПЛАЗМА - карыяплазма
КАРИОТИП - карыятып, -пу
КАРЛИКОВОЕ РАСТЕНИЕ - карлікавая расліна
КАРОТИН - каратын, -ну
КАРОТИНОИД - каратыноід, -ду
КАРТОФЕЛЬ - бульба
КАРТОФЕЛЬНЫЙ КРАХМАЛ - бульбяны крухмал
КАТАБОЛИЗМ - катабалізм, -му
КАТАБОЛИЧЕСКАЯ РЕАКЦИЯ - катабалічная рэакцыя
КАТАЛАЗА - каталаза
КАТАЛИЗ - каталіз, -зу
КАТАЛИЗАТОР - каталізатар, -ра
КАТАЛИТИЧЕСКИЙ ЦЕНТР - каталітычны цэнтр, -ра
КАТЕХИНЫ - катэхіны
КАТИОН - катыён, -на
КАТИОНООБМЕННИК - катыёнаабменнік, -ка

КАУЧУК - каўчук, -ку
КАУЧУКОНОС - каўчуканос, -су
КАЧАЛКА - качалка
КАЧЕСТВЕННОЕ ОПРЕДЕЛЕНИЕ
якаснае вызначэнне
КВАНТОВЫЙ ВЫХОД
ФОТОСИНТЕЗА - квантавы выхад
фотасінтэзу
КЕРАТИН - кератын, -ну
КЕТОГЛУТАРОВАЯ КИСЛОТА -
кетаглутаравая кіслата
КЕТОЗА - кетоза
КЕТОН - кетон, -ну
КИНАЗА - кіназа
КИНЕТИН - кінетын, -ну
КИНЕТОХОР - кінетахор, -ра
КИНИНЫ - кініны
КИПЕНИЕ - кіпенне
КИПЯТОК - кіпень, -пню, вар, -ру
КИПЯЩИЙ - кіпячы
КИСЛИЦА - кісліца
КИСЛОРОД - кісларод, -ду
КИСЛОРОДНЫЙ ЭФФЕКТ -
кіслародны эфект, -ту
КИСЛОТА – кіслата
К. АСКОРБИНОВАЯ -
к. аскарбінавая
К.ДЕЗОКСИРИБОНУКЛЕИНОВАЯ -
